УДК 94(476)«1921–1939»

**В. Ю. Булатая**
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», вул. Маскоўская, 15,
220007 Мінск, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 211 57 25, wiktoriarumianek@gmail.com

# АДЛЮСТРАВАННЕ І АЦЭНКА ПАДЗЕЙ АДРАДЖЭННЯ ЦАРКОЎНАЙ УНІІ Ў МАТЭРЫЯЛАХ ГАЗЕТЫ “KRYNICA” (“BIAŁORUSKAJA KRYNICA”) У МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

Артыкул прысвечаны стаўленню беларускіх каталіцкіх актывістаў да працэсу распаўсюджвання неауніі ў міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якое было адлюстравана на старонках газеты “Krynica”. Даследаванне скіравана на вызначэнне пазіцыі, якой прытрымлівалася канкрэтная грамадская супольнасць у дачыненні да неауніі. Дзеля вырашэння даследчай задачы былі прааналізаваны прадстаўленыя ў бібліятэчных зборах нумары газеты “Krynica” з красавіка 1921 года па верасень 1939-га. Вынікі даследавання паказалі, што беларускія каталіцкія актывісты негатыўна ставіліся да распаўсюджвання неауніі. Яны тлумачылі гэта тым, што з’ява не задавальняла інтарэсы беларускага народу, не прыносіла аніякага рэлігійнага плёну і насіла палітычны характар. Аднак да ідэі злучэння Праваслаўнай і Каталіцкай царквы яны ставіліся пазітыўна.

**Ключавыя словы:** неаунія; Беларуская хрысціянская дэмакратыя; газета “Krynica”; канфесіянальная палітыка; Заходняя Беларусь.
Бібліягр.: 18 назваў.

**V. Bulataja**
State Institution of Education “National Institute for Higher Education”,
15 Moscow Str., 220007 Minsk, the Republic of Belarus, 375 (29) 211 57 25, wiktoriarumianek@gmail.com

# REFLECTION AND EVALUATION OF THE EVENTS OF THE REVIVAL OF THE CHURCH UNION IN THE MATERIALS OF THE NEWSPAPER “KRYNICA” (“BIAŁORUSKAJA KRYNICA”) IN THE INTERWAR PERIOD

The article is devoted to the attitude of Belarusian Catholic activists to the process of spreading neounion in the interwar period on the territory of Western Belarus, which was reflected on the pages of the newspaper “Krynica”. The study aims to determine the position held by a particular community in relation to neounion. In order to solve the research problem, the issues of the newspaper “Krynica” presented in the library collection from April 1921 to September 1939 were analyzed. The results of the research showed that Belarusian Catholic activists had a negative attitude to the spread of neo-union. They explained this by the fact that the phenomenon did not satisfy the interests of the Belarusian people, did not bring any religious results and was of a political nature. However, they were positive about the idea of uniting the Orthodox and Catholic Churches.

**Key words:** neounion; BCD; the newspaper “Krynica”; confessional politics; Western Belarus.
Ref.: 18 titles.

**Уводзіны.** У міжваенны час на тэрыторыі Заходняй Беларусі адбываўся працэс адраджэння царкоўнай уніі, якая была прынята Берасцейскім саборам у 1596 годзе і скасаваная Полацкім царкоўным саборам у 1839-м. У 1924 годзе біскуп Генрык Пшэздзецкі атрымаў ад Рымскага Папы спецыяльныя паўнамоцтвы па распаўсюджванні неауніі ва ўсходніх ваявод-

© Булатая В. Ю., 2022

ствах Другой Рэчы Паспалітай. Па прапанове Ватыкана да гэтай работы далучыліся і манаскія каталіцкія ордэны — бенедыктынцы, францысканцы, дамініканцы [1, с. 116]. Пазіцыя польскага ўраду не супярэчыла інтарэсам Апостальскай сталіцы, якая на заходнебеларускіх землях перадусім спадзявалася назапасіць досвед, патрэбны для планаванай будучай унійнай працы ў Расіі, і не імкнулася ўзмацняць масавую свядомасць мясцовага насельніцтва [2, с. 432].

Варта разумець, што неаунія на землях Заходняй Беларусі распаўсюджвалася ва ўмовах шматканфесійнага насельніцтва. Дзейнасць уніятаў галоўным чынам была скіравана на канфесійнае перавыхаванне праваслаўных жыхароў. Але апорай уніі ў Заходняй Беларусі былі менавіта беларусы-каталікі, нашчадкі колішніх уніятаў [1, с. 120]. Улічваючы гэтыя акалічнасці, стаўленне да працэсу распаўсюджвання неауніі ў Заходняй Беларусі было неадназначным як з боку Польскай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, так і з боку беларускага рыма-каталіцкага духавенства, пазіцыя якога цудоўна адлюстравана на старонках тагачасных друкаваных выданняў.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Даследчую зацікаўленасць для нас уяўляюць публікацыі ў газеце “Kryniсa” (“Białoruskaja Krynica”), якая выдавалася беларускімі каталіцкімі актывістамі партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» (далей — БХД). Гэта абумоўлена тым, што ў масе матэрыялаў адлюстроўвалася пазіцыя актывістаў БХД, якія пераважна былі звязаны з колам беларускага рыма-каталіцкага духавенства. Дзякуючы таму, што газета стабільна выходзіла адносна доўгі час, мы можам прасачыць дынаміку стаўлення да неауніі.

Матэрыяламі даследавання сталі нумары газеты “Krynica” (“Białoruskaja Krynica; 1917—1940). Выдавецкі орган газеты — БХД. У 1921 годзе газета пазіцыянавала сябе як хрысціянска-дэмакратычная, з 1921 па 1927 год — сялянская газета, у 1927—1939 гадах — палітычная, грамадская і літаратурная газета [3, с. 107]. Яна выходзіла раз на тыдзень, аднак часта канфіскоўвалася ўладамі. У 1926 годзе “Krynica” была зачынена, замест яе стала выходзіць “Białoruskaja Krynica” [4, с. 547]. З 1937 года выхад газеты стаў нерэгулярным праз закрыццё яе на пэўны час.

З той прычыны, што выдавецкі орган газеты “Krynica” — БХД, у якой большая частка кіраўніцтва была прадстаўлена каталіцкімі актывістамі і святарамі, асноўны змест газеты складалі публікацыі аб праблемах Каталіцкага касцёла ў межах міжваеннай Заходняй Беларусі. Але ў газеце выходзілі матэрыялы і пра жыццё і навіны з іншых канфесій. У прыватнасці, маса публіцыстычных матэрыялаў у газеце была прысвечана распаўсюджванню неауніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Пры падрыхтоўцы артыкула выкарыстоўваліся агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз) і спецыяльныя гістарычныя метады даследавання (кантэнт-аналіз, гісторыка-параўнальны).

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Прааналізаваўшы публіцыстычныя матэрыялы, у якіх узнімалася тэма неауніі, былі вызначаны наступныя тэматычныя рубрыкі, у якіх акрэсліваецца стаўленне да працэсу адраджэння царкоўнай уніі, яго асаблівасці: 1) унія як тэарэтычны саюз Праваслаўнай царквы і Рыма-каталіцкага касцёла ў Беларусі; 2) унія — чужая для беларусаў з’ява (па меркаванні аўтараў газеты “Krynica”); 3) выказванне праваслаўных беларускіх дзеячаў на тэму распаўсюджвання неауніі; 4) пазіцыя актывістаў БХД адносна з’яўлення новай царкоўнай уніі.

*Унія як тэарэтычны саюз Праваслаўнай царквы і Рыма-каталіцкага касцёла ў Беларусі.* У 1921 годзе папулярнай рубрыкай газеты “Krynica” стала рубрыка «Куток аб уніі», дзе аўтары разважалі аб паяднанні Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла [5, с. 2; 6, с. 2; 7, с. 2]. Аўтары былі захоплены гэтай ідэяй і цалкам яе падтрымлівалі. Аднак маленькія публікацыі хутчэй насілі тэарэтычны характар, чым практычны. Аўтары заяўралі, што ідэю унію яны падтрымлівалі і будуць падтрымліваць. Яны сцвярджалі і разумелі, што «падзел беларусаў каталікоў і праваслаўных, такія іх узаемныя адносіны, як цяпер, зусім ненармальныя і шкодныя» [8, с. 2]. Трагедыяй актывісты лічылі, што беларусы-каталікі знаходзяцца пад польскім уплывам, а Праваслаўная царква — пад маскоўскім. Унія ж магла, на думку актывістаў, устараніць такое становішча рэлігійных беларусаў. Таксама аўтары газеты ўдакладнілі, што такім чынам меркавалі

адны яны: «Мы беларусы каталікі, асабліва беларускае каталіцкае духавенства. Проціў нас усё польскае духавенства, бо такія нашы планы стаяць упоперак польскаму касцёлу…» [8, с. 2]. Таксама яны бачылі трагедыю ў тым, што паміж польскасцю і каталіцтвам у Заходняй Беларусі часта ставілі знак роўна [8, с. 2]. Але пасля таго, як неаунія стала распаўсюджвацца на тэрыторыі Беларусі, стаўленне аўтараў газеты “Krynica” да з’явы стала ўжо далёка не такім прыязным.

*Унія — чужая для беларусаў з’ява (па меркаванні аўтараў газеты “Krynica”).* Такі тэзіс прасочваўся літаральна ва ўсіх публікацыях, якія выходзілі ў газеце “Krynica” на тэму распаўсюджвання уніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў перыяд з 1925 па 1936 год. Сярод шэрагу разваг аўтараў газеты можна вылучыць некалькі падстаў, паводле якіх яны ўсяляк намагаліся прасоўваць думку аб няшчырасці неауніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

*Польскае духавенства.* Чужой неаунія, па меркаванні каталіцкіх беларускіх актывістаў, была таму, што за яе рэалізацыю на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўзялося польскае каталіцкае духавенства. Так, адзін з аўтараў пісаў, што трагедыя неауніі была ў тым, што да адраджэння уніі спрычыніліся «польскія езуіты» [9, с. 1]. Аўтар тлумачыў гэта тым, што яны пайшлі па лініі польскай традыцыйнай палітыкі, абмінаючы пры гэтым мову і характар беларусаў [9, с. 1]. Варта адзначыць, што арганізацыйна візантыйска-славянскі абрад Каталіцкай царквы не меў уласнай іерархіі і падпарадкоўваўся мясцовым рымска-каталіцкім біскупам. Біскуп Мікалай Чарнецкі, які быў прызначаны ў 1931 годзе апостальскім візітатарам парафій усходняга абраду, юрыдычнай улады не меў [1, с. 117]. Таму ў публікацыях часта прасочваўся тэзіс: у справах уніі не павінна быць польскага вышэйшага і ніжэйшага духавенства, якое не хоча слухаць аб патрэбах беларускага народу [10, с. 1]. У сувязі з гэтым, па меркаваннях аўтараў газеты, пераход у унію беларусаў адбываўся з карысных выгод. Да уніі далучаліся або тыя, «што павадзіліся з сваім свяшчэннікам, або тыя, што дзеля розных асабістых мэтаў хочуць мець добрую марку ў палякаў, а таксама тыя, хто пабачыў, што прадстаўнікі альбертынскай місіі за духоўныя паслугі бяруць менш грошай, чым праваслаўныя, або зусім не бяруць» [9, с. 1].

*Недавер да матываў тых святароў, якія распаўсюджвалі унію.* У артыкуле «У справе рэлігійнай уніі» ў 1931 годзе аўтар растлумачыў, чаму няпэўнымі з’яўляюцца матывы распаўсюджвання неауніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Небяспеку аўтары бачылі ў тым, што беларусаў-каталікоў палякі лічылі за сваіх, «яны перакана్ны, што каталіцкі касцёл, будучы ў Польшчы “польскім” касцёлам — хутчэй ці пазней прыцягне беларусаў-каталікоў да польскай культуры і народнасці» [11, с. 1]. Аднак зусім не так было з праваслаўным насельніцтвам. З аднаго боку, там укараніўся ўплыў Расіі, а з другога — існавала нянавісць да Польшчы. Адпаведна, для таго, каб выкараніць гэтыя два чыннікі ў праваслаўных, «трэба ад іх адняць іх фундамент — праваслаўе». Дзеля гэтага былі абраны два кірункі: ужыванне сярод праваслаўных лацінскага абраду і распаўсюджванне непасрэдна неауніі. Аўтар артыкула непакоіўся тым, у якой форме неаунія будзе праводзіцца далей, якія людзі будуць у гэтым задзейнічаны: «Дагэтуль форма была расейская: расейскі абрад, расейская мова і г. д., людзі таксама пераважна расейцы, дык такія расейцы, каторыя знаходзяцца на службе ў палякаў, а такія, як ведама, найгоршыя. Дык справа уніі і для нас беларусаў дагэтуль вельмі прыкрая» [11, с. 1].

Варта адзначыць і публікацыю «Пункты ў справе рэлігійнай уніі» за 1931 год, аўтар якой падпісаўся псеўданімам «Вясковец». У ёй аўтар разгледзеў адносіны вясковых жыхароў да справы неауніі. Так, па меркаванні аўтара, у народзе шмат кажуць пра унію, аднак ён «у справе уніі яшчэ не мае ніякага паняцьця» [12, с. 1]. Па меркаванні аўтара, у справе уніі не павінна быць польскага вышэйшага і ніжэйшага духавенства, якое не хоча слухаць аб патрэбах беларускага народу. Таксама аўтар адзначыў недавер вяскоўцаў да езуітаў. Гэты факт ён звязаў з гістарычнай памяццю і прачытаннем раней кніг рускай класікі [12, с. 1].

*Распаўсюджванне неауніі з дапамогай камісій “Pro Russia”.* Насцярожвала актывістаў і тое, што унія праводзілася на тэрыторыі Заходняй Беларусі пад загадамі камісіі “Pro Russia”. Аўтар пад псеўданімам «Вясковец» перакана্ны, што свядомыя беларусы баяліся не толькі паланізацыі, але і русіфікацыі. Ён зрабіў выснову, што ў Рыме Беларусь не прызнавалі, калі дзейснасць адбывалася пад такой назвай. Аўтар перакананы, што становішча было б

не такое жахлівае, калі б пад мэтавую аўдыторыю траплялі рускія, але пад гэта траплялі і беларусы, і ўкраінцы [10, с. 1].

*Выказванне праваслаўных беларускіх дзеячаў на тэму распаўсюджвання неауніі.* У 1930 годзе на старонках "Krynica" праваслаўнае жыццё ў Заходняй Беларусі сталі рэгулярна асвятляць і ўласныя праваслаўныя аўтары. Гэта звязана з тым, што пасля 1926 года газета пашырыла сваю аўдыторыю: цяпер гэта былі не толькі каталікі, але і праваслаўныя Заходняй Беларусі [13, с. 1]. Так, аўтары пісалі пад псеўданімамі «Праваслаўны беларус», «Міранін-беларус», «Праваслаўны дзеяч». Тэмы, на якія былі гэтыя матэрыялы: беларусізацыя рэлігійнага жыцця, магчымасць аб'яднання царквы і касцёла, шкода неауніі для беларускага грамадства. У гэтым плане беларускія каталіцкія і праваслаўныя актывісты аказаліся салідарныя.

Праваслаўны дзеяч тлумачыць пераход праваслаўных у неаунію наступным чынам: «Праваслаўная царква на нашых землях апанавана чужынцамі, таму людзі, ратуючыся, пераходзяць у вунію» [14, с. 1]. Аўтар пісаў, што, на думку свядомых беларусаў, лепшым сродкам ратавання беларускасці ў рэлігійным жыцці з'яўляўся пераход у унію. Дзеля гэтага аўтар заклікаў пачаць рашучае змаганне ўнутры Праваслаўнай царквы, бо, па-першае, унія ў Польшчы заўжды была залежнай ад польскага ўраду, па-другое, яна была залежная ад польскіх біскупаў; па-трэцяе, ён меркаваў, што хоць і казалі, што за прыхільнікаў усходняга абраду заступаўся Рым, аднак ён мала звяртаў увагі на нацыянальныя імкненні кожнага народу. Прынамсі, пакуль Беларусь не атрымае незалежнасць, Рым аб ёй клапаціцца не збіраўся [14, с. 1].

*Пазіцыя актывістаў БХД адносна з'яўлення новай царкоўнай уніі.* У другой палове 1920 — першай палове 1930-х гадоў побач з крытыкай неауніі ў газеце "Krynica" з'яўляліся матэрыялы і аб тым, як, на погляд аўтараў, трэба было б правільна здзейсніць саюз царквы і касцёла на тэрыторыі Заходняй Беларусі:

1) стварэнне беларускага ўніяцкага біскупства. Каталіцкія актывісты лічылі, што біскупы мусілі быць незалежнымі ад польскіх біскупаў, а залежнымі мусілі быць ад Апостальскай сталіцы [10, с. 1]. Біскуп мусіў мець пад сваім загадам парафіі, духавенства і семінарыю. На думку каталіцкіх беларускіх актывістаў, ідэальны варыянт уніі — гэта злучэнне каталікоў і праваслаўных пад кіраўніцтвам Папы Рымскага [15, с. 1];

2) беларускае духавенства. З той прычыны, што, па меркаванні аўтараў, польскім святарам беларускі народ не давяраў, яны былі перакананы, што працу мусіла рабіць беларускае духавенства, тады народ мог бы за імі пайсці [12, с. 1];

3) унія мусіла стаць рэлігійным праектам, а не палітычным, якім, на думку актывістаў і аўтараў, і з'яўлялася неаунія.

У кантэксце прадстаўленага даследавання асобна звернем увагу на аспект асвятлення падзей, звязаных з неауніяй. На старонках газеты сустракаліся матэрыялы, у якіх асвятляўся працэс распаўсюджвання неауніі, вынікі ўнійных канферэнцый біскупаў. Такія артыкулы маглі як суправаджацца каментарыямі аўтараў, так і падавацца як простая інфармацыя [16, с. 2; 17, с. 1; 18, с. 2].

**Заключэнне.** Праанаілізаваўшы публіцыстычныя матэрыялы, прысвечаныя працэсу адраджэння царкоўнай уніі, можна вызначыць наступныя асаблівасці стаўлення да яго грамадскіх актывістаў з кола газеты "Krynica":

1) у 1921 годзе панавалі ідэалістычныя ўяўленні аб царкоўнай уніі. Па меркаванні аўтараў, на той час аб'яднанне цэркваў магло б вырашыць шэраг нацыянальных пытанняў, згуртаваўшы беларускі народ на адной канфесійнай глебе;

2) з таго моманту, як адраджэнне царкоўнай уніі станавілася рэальнасцю, стаўленне да яе на старонках газеты "Krynica" рэзка мяняецца ў негатыўны бок. Агульнае стаўленне можна сфармуляваць тэзісам «Унія — чужая для беларусаў з'ява». Прычына гэтаму — прысутнасць польскага элемента ў царкоўных структурах грэка-каталіцкай царквы і недавер да духавенства, якое рэалізоўвала неаунію;

3) негатыўнае стаўленне да неауніі — рэдкі выпадак, калі пазіцыя каталіцкіх і праваслаўных актывістаў беларускага нацыянальнага руху супала.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Загідулін, А. М.* Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.) / А. М. Загідулін. — Гродна : ГрДУ, 2010. — 183 с.
2. *Туронак, Ю.* Мадэрная гісторыя Беларусі / Ю. Туронак. — Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2008. — 882 с.
3. *Говін, С. В.* Канфесійны друк у Беларусі / С. В. Говін. — Мінск : Беларус. дзярж. ун-т, 2008. — 287 с.
4. *Станкевіч, А.* З Богам да Беларусі / А. Станкевіч. — Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2008. — 1097 с.
5. Krynica. — 1921. — № 29.
6. Krynica. — 1921. — № 27.
7. Krynica. — 1921. — № 23.
8. Krynica. — 1921. — № 16.
9. Białoruskaja Kryniсa. — 1927. — № 34.
10. Białoruskaja Kryniсa. — 1931. — № 34.
11. Białoruskaja Kryniсa. — 1931. — № 17.
12. Białoruskaja Kryniсa. — 1931. — № 34.
13. Białoruskaja Kryniсa. — 1926. — № 1.
14. Białoruskaja Kryniсa. — 1932. — № 36.
15. Białoruskaja Kryniсa. — 1929. — № 11.
16. Białoruskaja Kryniсa. — 1931. — № 27.
17. Białoruskaja Kryniсa. — 1933. — № 20.
18. Białoruskaja Kryniсa. — 1933. — № 27.

Паступіў у рэдакцыю 27.09.2021.